*Т.А. Стоцік*
*БДЭУ (Мінск)*

# ЭЛЕМЕНТЫ ДВАРАНСКАГА САМАКІРАВАННЯ Ў ПАЛІТЫЧНЫМ ЛАДЗЕ ГУБЕРНЯЎ БЕЛАРУСІ У XIX — ПАЧАТКУ XX ст.

Карпаратыўная арганізацыя расійскага дваранства заканадаўча была афармлена «Даравальнай граматай дваранству» (1785), па якой вышэйшае саслоўе атрымала поўнае самакіраванне на ўзроўні павятовых і часткова губерні. Заканадаўства, рэгулюючае дваранскае самакіраванне з некаторымі зменамі, было да 1917 г. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі яно распаўсюджвалася і на набілітэт Беларусі.

Закон прадугледжваў пагубернскую арганізацыю вышэйшага саслоўя. Вышэйшымі органамі таварыстваў з'яўляліся губернскія і павятовыя сходы. Павятовыя звычайна займаліся падрыхтоўкай да губернскіх: праверкай спісаў дваран павета, высвятленнем іх выбарчых правоў і г.д. Усе вышэйшыя карпаратыўныя справы вырашаліся на губернскіх сходах. Ім належала права і гэта лічылася адной з важнейшых прывілей — падаваць праз губернскіх прадвадзіцеляў ці дэпутатаў прашэнні або скаргі губернскаму начальству, міністрам і непасрэдна імператару. Губернскі прадвадзіцель афіцыйна лічыўся першай пасля губернатара асобай у губерні. Павятовы ж быў сапраўдным гаспадаром павета, ён фактычна замяняў павятовае звяно у мясцовым бюракратычным апараце.

У беларускіх губернях апошнія выбары ў павятовыя і губернскія дваранскія сходы адбыліся ў канцы 1858 — пачатку 1859 г. Наступныя павінны былі адбыцца ў снежні 1861 г. і ў студзені 1862 г., але ў краі пачаліся хваляванні сярод дваран рымска-каталіцкага веравызнання, якія складалі тут абсалютную большасць. Таму ўжо на пачатку 1861 г. у адпаведнасці з царскім указам адтэрміноўваліся дваранскія выбары ў Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях у сувязі з пераводам іх на ваеннае становішча. У сувязі з адтэрміноўкай дваранскіх выбараў прадвадзіцель дваранства Віцебскай губерні меў намер склікаць губернскі сход у 1862 г. для абмеркавання такіх прыватных пытанняў, як аб заснаванні таварыства сельскай гаспадаркі і іншых, але міністр унутраных спраў забараніў склікание гэтага сходу.

Па Закону ад 17 сакавіка 1867 г. начальніку Паўночна-Заходняга краю было дадзена права замяшчаць пасады ўсіх прадвадзіцеляў дваранства толькі асобамі рускай нацыянальнасці па прызначэнні ўрада, але ўжо ў 1868 г. генерал-губернатару Патапаву было

дазволена ў крайніх выпадках прызначаць на пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства асоб каталіцкага веравызнання.

На пасяджэннях 15, 22 і 23 сакавіка 1905 г. Камітэт Міністраў заняўся пытаннем аднаўлення дваранскіх выбараў у дзевяці заходніх губернях. У выніку дыскусіі урад выказаўся за «аднаўленне дваранскіх сходаў з прадстаўленнем ім права выбіраць дэпутатаў і павятовых прадвадзіцеляў дваранства». Хаця ў іменным Законе ад 1 мая 1905 г. і гаварылася аб узнаўленні дваранскіх выбараў, але там было і палажэнне, па якому асобы польскага паходжання не маглі займаць адміністрацыйныя пасады у ведамстве Міністэрства ўнутраных спраў.

Пытанне аб аднаўленні выбараў у дзевяці заходніх губернях падымалася у III Дзяржаўнай думе у сувязі з увядзеннем земстваў, але пракастрычніцкая большасць забалаціравала яго.

Пытанне аб тым, чаму не былі рэалізаваны палажэнні Закона ад 1 мая 1905 г., зноў было паднята ў пачатку 1914 г. у IV Дзяржаўнай думе. Яго агучыла фінансавая камісія Думы пры разглядзе пытання аб павышэнні акладаў засядацелям дваранскай апекі Віцебскай губерні. Тлумачэнні Міністэрства унутраных спраў аб прычынах неаднаўлення дваранскіх выбараў не перакапалі камісію. Але пачатак Першай сусветнай вайны адклаў гэтае пытанне на няпэўны час.

***М.А. Таболич***

*БГЭУ (Минск)*

## ЗЕМСКАЯ РЕФОРМА И ОСОБЕННОСТИ ЕЕ ПРОВЕДЕНИЯ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

В начале XX в. Беларусь входила в состав Российской империи и на административном уровне была представлена пятью губерниями. Это обстоятельство способствовало тому, что здесь проводились (за редким исключением) такие же экономические и политические мероприятия, как и в центральных губерниях России. В 1903 г. была предпринята попытка организовать органы территориального самоуправления — земства — в Минской, Витебской и Могилевской губерниях. Созданные земства в отличие от внутрироссийских формировались не на основе выборов, а распоряжений соответствующих губернаторов и министра внутренних дел.

Вводя земские органы самоуправления в западных губерниях, царское правительство преследовало следующие цели:

• упрочить позиции и влияние русских помещиков и православного духовенства среди крестьян, создав тем самым благопри-



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by